УДК 373.3:82

**Доўгаль Дзмітрый Аляксандравіч**
Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова
(г. Магілёў, Беларусь)
douhal_da@msu.by

# ЖАНРАВАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ КОЛА ЧЫТАННЯ НА ПЕРШАЙ СТУПЕНІ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ

У артыкуле характарызуецца жанравы аспект кола чытання вучняў пачатковых класаў. Устаноўлена жанравая разнастайнасць твораў для чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

**Ключавыя словы:** жанр, жанравая разнавіднасць, кола чытання

The article characterizes the genre aspect of the reading circle of primary school students. The genre diversity of works for reading at the first stage of general secondary education has been established.

**Keywords**: genre, genre variety, reading circle

Кола чытання малодшых школьнікаў уключае разнастайныя па змесце і форме творы прыгожага пісьменства. Аналіз мастацкага твора павінен ажыццяўляцца з улікам яго родава-жанравых характарыстык. Як справядліва адзначае І.М. Страмок, ігнараванне або няведанне родавай і жанравай спецыфікі мастацкага твора з'яўляецца адным з істотных недахопаў аналізу твораў, якія вывучаюцца ў пачатковых класах [1]. У сувязі з гэтым паўстае пытанне вызначэння жанравай прыналежнасці твораў, прапанаваных для чытання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

У праграмным пераліку ўменняў, якія павінны быць сфарміраваныя пры засваенні вучэбнага прадмета "Беларуская літаратура (літаратурнае чытанне)", ёсць тыя, што прадугледжваюць адрозненне і называнне пэўных жанраў, а таксама вызначэнне іх жанравых асаблівасцей. Поўны пералік гэтых жанраў прадстаўлены ў табліцы 1.

*Табліца* 1

**Жанры, знаёмства з якімі прадугледжана вучэбнымі праграмамі па літаратурным чытанні на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі**

| Клас | Фальклор | Аўтарская літаратура |
|---|---|---|
| 2 | *пацешкі, прыказкі, скорагаворкі, загадкі, казкі* | *апавяданне, верш, казка* |
| 3 | *народная песня, казка, прыказка* | *апавяданне, верш, казка* |
| 4 | *легенда* | *літаратурная казка, апавяданне, байка, аповесць-казка, верш* |

Функцыянальнае прызначэнне твораў розных жанраў неаднолькавае. Творы малых маўленчых жанраў (загадкі, скорагаворкі, прыказкі) выконваюць дапаможную функцыю: яны выкарыстоўваюцца для выпрацоўкі пэўных якас-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

цей навыку чытання (скорагаворкі), працы над спасціжэннем ідэйнага зместу твораў (прыказкі), служаць сродкам развіцця слоўнікавага запасу і пазнавальнай актыўнасці вучняў (загадкі). Творы, якія адносяцца да "вялікіх" жанраў, служаць матэрыялам для чытання і аналізу, што дазваляе рэалізаваць асноўныя задачы вучэбнага прадмета – знаёміць з багатым светам беларускай дзіцячай літаратуры, далучаць вучняў да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцей.

Знаёмства з жанравай разнастайнасцю фальклорных і літаратурных твораў прадугледжвае засваенне дыферэнцыйных прымет некаторых жанравых разнавіднасцей верша (верш-апісанне, верш-партрэт, верш-разважанне), казкі (чарадзейныя, пра жывёл, бытавыя), народнай песні (калыханкі, восеньскія, калядныя, вяснянкі), апавядання (мастацкае, навукова-пазнавальнае).

Разам з тым аналіз вучэбных дапаможнікаў, у якіх прадстаўлены творы, прапанаваныя для чытання і вывучэння ў пачатковых класах, сведчыць пра больш шырокі жанравы дыяпазон літаратурнага матэрыялу. Так, у вучэбнай праграме і дапаможніку для 4-га класа [2; 3] намі адзначаны творы наступных жанраў (гл. табліцу 2).

*Табліца 2*

**Жанравая разнастайнасць твораў для чытання і вывучэння ў вучэбным дапаможніку па літаратурным чытанні для 4-га класа**

| Жанр | Жанравая разнавіднасць | Прыклад твора |
|---|---|---|
| верш | верш-апісанне | *В. Гардзей "Жнівень"* |
| | верш-разважанне | *А. Грачанікаў "Бацькоўскі парог"* |
| | верш-партрэт | *В. Жуковіч "Першая настаўніца"* |
| апавяданне | эпічны (вершаванае апавяданне) | *Г Пашкоў "Ыратаванне вожыка"* |
| | мастацкае (лірычнае) | *Р. Ігнаценка "Бабіна лета"* |
| | мастацкае (эпічнае) | *М. Даніленка "Журка"* |
| | навукова-пазнавальнае | *М. Чарняўскі "Слуцкія паясы"* |
| казка (літаратурная і народная) | бытавая | *"Ад крадзенага не пасыцееш"* |
| | чарадзейная (чароўная) | *"Музыка-чарадзей"* |
| | пра жывёл | *"Вавёрка піша сачыненне" (паводле А. Карлюкевіча)* |
| народная песня | калыханка | *"Люлі-люлі-люлі..."* |
| байка | | *Э. Валасевіч "Шпачыны канфуз"* |
| балада | | *М. Чарняўскі "Клятва Марата Казея"* |
| паэма | | *К. Цвірка "Да зорак"* |
| эсэ | | *Б. Сачанка "Адкуль пайшоў твой род?"* |
| нарыс | | *"Горад з Белаю вежаю" (паводле А. Каско)* |
| легенда | | *"Адкуль песня беларуская"* |

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У коле чытання прадстаўлены ўсе жанры і жанравыя разнавіднасці твораў, акрэсленыя ў праграме (вершы і апавяданні розных відаў, літаратурныя і народныя казкі, песні, байкі, легенды). Адзінае выключэнне складае аповесць (аповесць-казка): з аб'ёмнымі творамі гэтага жанру малодшыя школьнікі знаёмяцца на пазакласным чытанні ("Дзед Манюкін і ўнукі" В. Шырко). Рэгулярна выкарыстоўваюцца ў дапаможніку не ўказаныя ў табліцы аўтарскія і фальклорныя творы малых жанраў – загадкі, прыказкі, прыметы, скорагаворкі.

Аднак разнастайнасць матэрыялу для чытання не вычэрпваецца жанрамі, акрэсленымі ў раздзеле праграмы "Фарміраванне чытацкіх уменняў і ўніверсальных вучэбных дзеянняў" (гл. табліцу 1). Акрамя байкі, для вывучэння прапануюцца творы такіх ліра-эпічных жанраў, як паэма ("Да зорак" К. Цвіркі) і балада – драматычна напружаны вершаваны твор гераічнага зместу ("Клятва Марата Казея" М. Чарняўскага). Падзел апавяданняў на мастацкія і навукова-пазнавальныя не адлюстроўвае ўсёй жанрава-стылёвай разнастайнасці невялікіх празаічных твораў, якія ўваходзяць у кола чытання. Акрамя ўласна мастацкіх эпічных і лірычных апавяданняў, у дапаможніку прадстаўлены творы мастацка-публіцыстычных жанраў: нарыс (невялікі твор, у аснове якога ляжыць апісанне жыццёвых фактаў) і эсэ (суб'ектыўнае разважанне вольнай кампазіцыі на пэўную тэму). Ёсць у пераліку твораў для чытання і мастацкая дакументалістыка: кніга ўспамінаў дзяцей вайны "Ніколі не забудзем", нарыс з адзнакамі рэпартажу "На касмічным караблі" П. Клімука.

Прадстаўлены ў вучэбным выданні [3] і сінкрэтычны жанр, які аб'ядноўвае мастацтва слова і выяўленчае мастацтва. Гаворка ідзе пра комікс, якім суправаджаецца беларуская народная казка "Андрэй за ўсіх мудрэй".

Такім чынам, кола чытання малодшых школьнікаў вылучаецца жанравай разнастайнасцю, уключае вершаваныя і празаічныя лірычныя, эпічныя і ліра-эпічныя творы мастацкага, мастацка-публіцыстычнага і навукова-пазнавальнага характару. Гэта патрабуе ад настаўніка пачатковых класаў грунтоўнай літаратуразнаўчай падрыхтоўкі і высокага метадычнага майстэрства пры вызначэнні эфектыўных прыёмаў чытання і аналізу твораў розных жанраў.

### Літаратура

1. Стремок, И. М. Методические рекомендации по изучению произведений разных жанров в начальной школе [Электронный ресурс] / И. М. Стремок. – 2023. – Режим доступа: https://new.academy.edu.by/files/documents/MD-MSOP/Primary_School/Metod_rek_zhanry.pdf. – Дата доступа: 30.11.2023.

2. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 4 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мн. : НІА, 2018. – Ч. 1. – 136 с.

3. Жуковіч, М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 4 класа агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мн. : НІА, 2018. – Ч. 2. – 128 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова